# Раннелітоўскія манеты і зліткі ў зборах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

Раман КРЫЦУК



Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь,
старшы навуковы супрацоўнік,
Рэспубліка Беларусь, г. Мінск,
e-mail: Kola.Sonca@gmail.com

Падборка раннелітоўскіх плацежных зліткаў і манет Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь дагэтуль была вядома шырокаму колу чытачоў толькі па асобных публікацыях у нумізматычнай і археалагічнай літаратуры і ўяўляла сабою адзінкавыя манеты. Між іншым за апошнія некалькі гадоў у фонды Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (далей – НГМ РБ) патрапілі некалькі скарбаў і адзінкавых манет, якія заслугоўваюць асобнай абагульненай публікацыі. Мэтай гэтага артыкула з'яўляецца ўвод у навуковы абарот такіх знаходак ці ўдакладненне інфармацыі аб іх. Прыведзеныя ніжэй грашовыя комплексы і адзінкавыя манеты размешчаны ў храналагічнай паслядоўнасці іх чаканкі і захавання, а не ў паслядоўнасці паступлення ў фонды НГМ РБ.

### Скарб грыўняў з вёскі Турэйск Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці

Адным з самых ранніх дэпазітаў з'яўляецца скарб з-пад вёскі Турэйск Шчучынскага раёна. Ён патрапіў у музейны фонд у канцы 2015 г. і складаецца з 5 грыўняў літоўскага (заходнерускага) тыпу, якія ў сучаснай літоўскай літаратуры называюцца «lietuviškas ilgasis». Дагэтуль комплекс быў апублікаваны ў «тэзісным» [1; 2] і навукова-папулярным [3, с. 36] выглядзе. Ён быў знойдзены ў 2009 г. на ўскрайку вёскі Турэйск Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, на краі правага высокага берага ракі Нёман. Бераг падмываецца вадою, таму месца знаходкі скарба абсыпалася ў раку. Грыўні былі знойдзены на глыбіні 30–35 см вертыкальна ўторкнутымі ў глебу і перавязанымі скураной папружкай, якая рассыпалася ў пыл падчас выкопвання дэпазіту (*малюнкі 1–3*).

Скарб складаецца з наступных срэбных зліткаў:

Ідэнтыфікацыйны нумар 050294/1. Палачкападобны злітак паўкруглага папярэчнага сячэння з паўкруглымі канцамі. Даўжыня – 128,5 мм, шырыня – 13 мм, вышыня – 9 мм, вага – 107,1 г, проба – 800–875° [4, с. 2]. Прысутнічаюць ракавіны ад ліцця, на бакавых ніжніх гранях сляды 27 буйных насечак, сляды іх загладжвання.

Ідэнтыфікацыйны нумар 050294/2. Палачкападобны злітак паўкруглага папярэчнага сячэння з дзвюма тупымі зарубкамі і з паўкруглымі канцамі. Даўжыня – 124 мм, шырыня – 13 мм, вышыня – 10 мм, вага – 120,7 г, проба – 875–916° [4, с. 2]. Прысутнічаюць вялікія і маленькія ракавіны ад ліцця, адна ракавіна на верхняй частцы грыўні візуальна вельмі падобна на зарубку. На бакавых ніжніх гранях сляды 36 буйных насечак і зарубачак, сляды іх загладжвання. На бакавой частцы бачна расколіна, якая атрымалася падчас выбіван-



*Скарб грыўняў з вёскі Турэйск: знешні бок, нумарацыя злева направа*

***Малюнак 1***



*Скарб грыўняў з вёскі Турэйск: тыльны бок, нумарацыя злева направа*

***Малюнак 2***



*Скарб грыўняў з вёскі Турэйск: бакавыя грані з насечкамі*

***Малюнак 3***

ня зарубкі вострым інструментам. З'яўляецца самым цяжкім сярод вядомых літоўскіх зліткаў гэтага тыпу.

Ідэнтыфікацыйны нумар 050294/3. Палачкападобны злітак паўкруглага папярэчнага сячэння, адзін з канцоў адсечаны ля асновы, другі канец паўкруглай формы. Даўжыня – 118,5 мм, шырыня – 14 мм, вышыня – 11 мм, вага – 108,65 г, проба – 500–600° [4, с. 2]. Ракавіны ад ліцця адсутнічаюць. На бакавых ніжніх гранях сляды 22 буйных насечак і зарубачак, сляды іх загладжвання.

Ідэнтыфікацыйны нумар 050294/4. Палачкападобны злітак паўкруглага папярэчнага сячэння з паўкруглымі канцамі. Даўжыня – 125 мм, шырыня – 14 мм, вышыня – 8,5 мм, вага – 106,42 г, проба – 800–875° [4, с. 2]. Прысутнічаюць вялікія і маленькія ракавіны ад ліцця. На бакавых ніжніх і верхніх гранях сляды 39 буйных насечак і зарубачак, сляды іх загладжвання.

Ідэнтыфікацыйны нумар 050294/5. Палачкападобны злітак паўкруглага папярэчнага сячэння, адзін з канцоў тупы, другі канец паўкруглай формы. Даўжыня – 127 мм, шырыня – 12,5 мм, вышыня – 9,5 мм, вага – 111,1 г, проба – 600–750° [4, с. 2]. Прысутнічаюць вялікія і маленькія ракавіны ад ліцця. На бакавых ніжніх і верхніх гранях, верхняй частцы грыўні сляды 73 буйных насечак і зарубачак, сляды іх загладжвання. На ніжняй частцы грыўні – невялічкія драпінкі і сляды ад удараў.

Гэты скарб можна датаваць другой паловай XIII ст. – першай паловай XIV ст. Гэты перыяд вядомы ў нумізматычнай літаратуры як «безманетны». Напэўна, скарб быў схаваны асобай сярэдняга ўзроўню заможнасці – заможным селянінам, мешчанінам ці дробным гандляром альбо рамеснікам. Прычыны захавання скарба дакладна не вядомыя, але іх можна звязаць з баявымі дзеяннямі літоўскіх і рускіх князёў у 1253 г. і 1276 г. і паходамі крыжакоў на Панямонне ў 1284–1348 гг. Дэпазіт быў схаваны ў спешцы на невялікай глыбіні, хутчэй з-за раптоўных для ўласніка абставін, якія не дазволілі лепш да іх падрыхтавацца.

### Скарб пенязяў часоў праўлення Уладзіслава II Ягайлы (1386–1434) з-пад вёскі Капачы Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці

У канцы 2017 г. у збор НГМ РБ быў перададзены скарб, які складаўся з 11 манет і іх фрагментаў. Ён быў выяўлены на поўдзень ад вёскі Капачы Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці, за 100–150 метраў ад паўночнага берага ракі Бярэзіны ў 2014–2015 гг. на месцы ляснога шляху. Дагэтуль публікаваўся толькі ў тэзісным [5] і навукова-папулярным [3, с. 42] выглядзе. Акрамя таго, увосень 2019 г. на месцы знаходкі скарба аўтарам артыкула былі праведзены археалагічныя працы (адкрыты ліст № 3476, форма № 2), вынікам якіх стала ўдакладненне абставін знаходкі скарба і выяўленне яшчэ дзвюх манет.

Скарб складаецца з наступных манет:

Ідэнтыфікацыйны нумар 053354/01 (*малюнак 4*). Аверс: леў ідзе ўправа, хвост пераходзіць у пляцёнку. Рэверс: імітацыя легенды, моцна змешчана ўверх (Гулецкі, № 3). Вага – 0,92 г; дыяметр – 15,3 × 14,6 мм.



***Малюнак 4***

Ідэнтыфікацыйны нумар 053354/02 (*малюнак 5*). Аверс: у цэнтры ў кропкавай абводцы – выява малога льва (рыба-пярсцёнак), вакол у кругавой абводцы – легенда (імітацыя легенды). Рэверс: у цэнтры – выява шчыта з шасціканцовым крыжам, вакол якога паміж двайной суцэльнай абводкі змешчаны геаметрычны арнамент. У двайной суцэльнай абводцы – кропкі (Гулецкі, № 32). Вага – 0,54 г; дыяметр – 13,6 × 13 мм.



***Малюнак 5***

Ідэнтыфікацыйны нумар 053354/03 (*малюнак 6*). Аверс: у цэнтры ў кропкавай абводцы – выява малога льва (рыба-пярсцёнак), вакол у кругавой абводцы – легенда (імітацыя легенды). Рэверс: у цэнтры – выява шчыта з шасціканцовым крыжам, вакол якога паміж двайной суцэльнай абводкі змешчаны геаметрычны арнамент. У двайной суцэльнай абводцы – кропкі (Гулецкі, № 32). Вага – 0,36 г; дыяметр – 12,6 × 13,4 мм.



***Малюнак 6***

Ідэнтыфікацыйны нумар 053354/04 (*малюнак 7*). Аверс: у цэнтры – грубая выява галавы ў анфас з доўгімі валасамі і каронай, вакол – кропкавая абводка. Рэверс – выява пляцёнкі, леў амаль не бачны з-за бруду і вокіслаў (Гулецкі, № 9). Вага – 0,44 г; дыяметр – 14,9 × 12,7 мм.



***Малюнак 7***

Ідэнтыфікацыйны нумар 053354/05 (*малюнак 8*). Аверс: у цэнтры – выява галавы ў анфас з доўгімі валасамі і каронай, вакол – кропкавая абводка, за ёй – нечытабельная легенда. Рэверс: леў, які ідзе ўлева, правая лапа паднятая, вушы доўгія, хвост пераходзіць у пляцёнку (Гулецкі, № 10). Вага – 0,8 г; дыяметр – 14,1 × 16,5 мм.



***Малюнак 8***

Ідэнтыфікацыйны нумар 053354/06 (*малюнак 9*). Аверс: у цэнтры – грубая выява галавы ў анфас з доўгімі валасамі і каронай, вакол – кропкавая абводка. Рэверс: леў, які ідзе ўлева, хвост пераходзіць у пляцёнку (Гулецкі, № 10?). Вага – 0,52 г; дыяметр – 14,7 × 15,0 мм.



***Малюнак 9***

Ідэнтыфікацыйны нумар 053354/07 (*малюнак 10*). Аверс: у цэнтры – выява галавы ў анфас з доўгімі валасамі і каронай, вакол – кропкавая абводка. Рэверс: леў, які ідзе ўправа (?), хвост пераходзіць у пляцёнку (Гулецкі, № 10?). Вага – 0,38 г; дыяметр – 11,3 × 13,1 мм, фрагмент манеты страчаны.



***Малюнак 10***

Ідэнтыфікацыйны нумар 053354/08 (*малюнак 11*). Аверс: у цэнтры – выява галавы ў анфас з доўгімі валасамі і каронай, вакол – кропкавая абводка, за ёй – легенда гатычнымі літарамі: «REG...A+». Рэверс: леў, які ідзе ўправа, вушы доўгія, хвост пераходзіць у пляцёнку (Гулецкі, № 9А). Вага – 0,9 г; дыяметр – 14,6 × 15,4 мм.



***Малюнак 11***

Ідэнтыфікацыйны нумар 053354/09 (*малюнак 12*). Аверс: у цэнтры – выява галавы ў анфас з доўгімі валасамі і каронай, вакол – кропкавая абводка, за ёй – легенда гатычнымі літарамі: «R...MAGNA+». Рэверс: леў, які ідзе ўправа, вушы доўгія, хвост пераходзіць у пляцёнку (Гулецкі, № 9А). Вага – 0,78 г; дыяметр – 15 × 14,5 мм.



***Малюнак 12***

Ідэнтыфікацыйны нумар 053354/10 (*малюнак 13*). Моцна зацёртая. На адным з бакоў праглядаецца



***Малюнак 13***



*Тэарэтычная прамалёўка крыжа*

***Малюнак 14***

выява шчыта з шасціканцовым крыжам (Гулецкі, № 32?, *малюнак 14*). Вага – 0,2 г; дыяметр – 11 × 12 мм.

Ідэнтыфікацыйны нумар 053354/11 (*малюнак 15*). Дробны фрагмент манеты. Вага – 0,1 г.

Ідэнтыфікацыйны нумар 053354/12 (*малюнак 16*). Палова манеты. Аверс: у цэнтры – выява галавы ў анфас з доўгімі валасамі і каронай, вакол – кропкавая абводка, за ёй – нечытабельная легенда. Рэверс: леў, які ідзе ўправа (?), хвост пераходзіць у пляцёнку (Гулецкі, № 10А?). Вага – 0,24 г; памер – 8 × 13 мм.



***Малюнак 15***



***Малюнак 16***

Акрамя таго, увосень 2019 г. падчас археалагічных даследаванняў на месцы знаходкі скарба былі выяўлены наступныя манеты:

1. Аверс: у цэнтры – выява галавы ў анфас з доўгімі валасамі і каронай, вакол – кропкавая абводка. Рэверс: леў, які ідзе ўправа (?), хвост пераходзіць у пляцёнку (Гулецкі, № 9D). Вага – 0,5 г; дыяметр – 15,5 × 14 мм (*малюнак 17*).



***Малюнак 17***

2. Два фрагменты адной манеты. Вага – 0,41 г; найвялікшы памер – 15,9 мм. Па краях абломкаў бачны сляды штучнага абразання. Верагодна, што на адным з бакоў змешчана выява льва, а на другім – выява двух тамгападобных (ці Ш-падобных, протакалюмн па версіі Я. Іванаўскаса) знакаў (*малюнак 18*) (Гулецкі, № 2В?).



*Малюнак 18*

Дзякуючы правядзенню археалагічных прац на месцы знаходкі скарба ўдалося ўдакладніць кантэкст яго захавання. Манеты знойдзены паасобна на лясным шляху на пляцоўцы памерам 15 х 7 м, без яскрава выражанага культурнага пласта[1]. Вялікая расцягнутасць манет і іх невялічкая колькасць сведчаць пра тое, што гэты скарб хутчэй за ўсё з'яўляўся невялічкім гаманцом, які быў выпадкова страчаны ці рассыпаны. Акрамя таго, скарб цікавы па сваім складзе – гэта першы дэпазіт на тэрыторыі Беларусі, у якім зафіксаваны манеты імітацыі (КП 53354/01) і манеты з тамгападобнымі сімваламі (№ 2 з мат. раскопак 2019 г.). Прыкладны час захавання скарба – 80-я гг. XIV ст. Гэты дэпазіт патрабуе больш дэталёвай апрацоўкі нумізматамі, якія спецыялізуюцца на манетах ранняга ВКЛ.

## Скарб з-пад вёскі Гарадок Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці

У пачатку 2017 г. у фонды НГМ РБ быў перададзены невялікі дэпазіт з 6 манет. Ён быў выяўлены побач з вёскай Гарадок Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці ў 2015 г., публікаваўся ў навукова-папулярным выглядзе [5, с. 43].

Скарб складаецца з наступных манет:

Ідэнтыфікацыйны нумар 052529/1 (*малюнак 19*). Пражскі грош, Чэхія, Вацлаў IV, Кутнагорскі манетны двор, 1378–1419 гг. Аверс: у цэнтры – выява кароны, вакол яе – два кольцы абводкі з легендамі гатычным шрыфтам. Унутранае кола: «WENCESLAVS TERCIVS», знешняе кола: «DEI GRATIA REX BOEMIE». Рэверс: у цэнтры – леў стаіць у левы бок, пярэднія лапы паднятыя, хвост – у выглядзе васьмёркі. Вакол у кропкавай абводцы – легенда гатычным шрыфтам: «GROSSI PRAGENSES». Вага – 2,52 г; дыяметр – 27,8 × 26,1 мм.



*Малюнак 19*

Ідэнтыфікацыйны нумар 052529/2 (*малюнак 20*). Пенязь, ВКЛ, Вільня, Вітаўт, 1410–1430 гг. Аверс: Калюмны, у цэнтры кропка, вакол – вяроўчатая абводка. Рэверс: дзіда з крыжам праваруч, вакол – вяроўчатая абводка. Вага – 0,36 г; дыяметр – 11,8 × 13,3 мм (Гулецкі, № 151А-В?).



*Малюнак 20*

Ідэнтыфікацыйны нумар 052529/3 (*малюнак 21*). Пенязь, ВКЛ, Вільня, Вітаўт, 1410–1430 гг. Аверс: Калюмны, вакол – вяроўчатая абводка. Рэверс: дзіда з крыжам леваруч, вакол – вяроўчатая абводка. Вага – 0,34 г; дыяметр – 12,7 × 12 мм (Гулецкі, № 150D?).



*Малюнак 21*

Ідэнтыфікацыйны нумар 052529/4 (*малюнак 22*). Пенязь, ВКЛ, Вільня, Вітаўт, 1410–1430 гг. Аверс: Калюмны, у цэнтры кропка, вакол – вяроўчатая абводка. Рэверс: дзіда з крыжам леваруч, вакол – вяроўчатая абводка. Вага – 0,28 г; дыяметр – 12,5 × 11,6 мм (Гулецкі, № 150В?).



*Малюнак 22*

[1] *Мяркуючы па таўшчыні і стратыграфіі слоя, ён утварыўся падчас існавання дарогі.*



*Малюнак 23*

Ідэнтыфікацыйны нумар 052529/5 (*малюнак 23*). Пенязь, ВКЛ, Вільня, Вітаўт, 1410–1430 гг. Аверс: Калюмны, вакол – вяроўчатая абводка. Рэверс: дзіда з крыжам праваруч (?), вакол – вяроўчатая абводка. Пакрыта вокісламі. Вага – 0,24 г; дыяметр – 11,6 × 12,8 мм (Гулецкі, № ?).

Ідэнтыфікацыйны нумар 052529/6 (*малюнак 24*). Пенязь, ВКЛ, Вільня, Вітаўт, 1410–1430 гг. Аверс: Калюмны, вакол – вяроўчатая абводка. Рэверс: дзіда з крыжам леваруч (?), вакол – вяроўчатая абводка. Пакрыта вокісламі. Вага – 0,28 г; дыяметр – 12,6 × 13,5 мм (Гулецкі, № ?).



*Малюнак 24*

Гэты дэпазіт цікавы тым, што разам са звычайнымі пенязямі тыпу Калюмны/Кап'ё ў яго склад уваходзіць і пражскі грош Вацлава IV. Ён захаваны хутчэй за ўсё ў прамежак часу паміж 1410–1430 гг. альбо крыху пазней.

## Скарб з-пад вёскі Бакшты Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці

Улетку 2019 г. у фонды НГМ РБ быў перададзены скарб, які складаецца з 7 манет. Комплекс знаходзіцца ў стане навуковай апрацоўкі, таму інвентарны нумар яму яшчэ не прысвоены. Ён быў выяўлены вясною 2019 г. у ваколіцах вёскі Бакшты Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці і дагэтуль не публікаваўся. Манеты былі знойдзены зліплымі ў слупок, недалёка ад меліярацыйнай канавы. З-за ўздзеяння вільгаці метал манет моцна акісліўся і стаў крохкім.

Скарб складаецца з наступных манет:

1. Пражскі грош, Чэхія, Вацлаў IV, Кутнагорскі манетны двор, 1378–1419 гг. (*малюнак 25*). Аверс: у цэнтры – выява кароны, вакол яе – два кольцы абводкі з легендамі гатычным шрыфтам. Унутранае кола: «WENCESLAVS TERCIVS», знешняе кола: «DEI GRATIA REX BOEMIE». Рэверс: у цэнтры – леў стаіць у левы бок, пярэднія лапы паднятыя, хвост – у выглядзе васьмёркі. Вакол у кропкавай абводцы – легенда гатычным шрыфтам: «GROSSI PRAGENSES». Вага – 1,93 г; дыяметр – 27,1 × 26,6 мм.



*Малюнак 25*

2. Пражскі грош, Чэхія, Вацлаў IV, Кутнагорскі манетны двор, 1378–1419 гг. (*малюнак 26*). Аверс: у цэнтры – выява кароны, вакол яе – два кольцы абводкі з легендамі гатычным шрыфтам. Унутранае кола: «WENCESLAVS TERCIVS», знешняе кола: «DEI GRATIA REX BOEMIE». Рэверс: у цэнтры – леў стаіць у левы бок, пярэднія лапы паднятыя, хвост – у выглядзе васьмёркі. Вакол у кропкавай абводцы – легенда гатычным шрыфтам: «GROSSI PRAGENSES». Вага – 2,23 г; дыяметр 27,7 × 26,5 мм.



*Малюнак 26*

3. Пражскі грош, Чэхія, Кутнагорскі манетны двор (*малюнак 27*). Выявы амаль цалкам зацёртыя. Вага – 2,6 г; дыяметр – 26,7 × 27,2 мм.



*Малюнак 27*



*Малюнак 28*

4. Пенязь, ВКЛ, Вільня, Казімір Ягелончык, 1440–1492 гг., абламаны (*малюнак 28*). Аверс: Калюмны, вакол – кропкавая абводка. Рэверс: Пагоня ў правы бок, вакол – кропкавая абводка. Вага – 0,19 г; дыяметр – 13,5 × 12,5 мм.

5. Пенязь, ВКЛ, Вільня, Казімір Ягелончык, 1440–1492 гг., 2/3 манеты (*малюнак 29*). Аверс: Калюмны, у цэнтры – дзве вертыкальныя рыскі, левая верхам дакранаецца да Калюмн, вакол – кропкавая абводка. Рэверс: Пагоня ў правы бок, абводка адсутнічае (?). Вага – 0,21 г; памер – 14 × 10 мм.



*Малюнак 29*

6. Пенязь, ВКЛ, Вільня, Казімір Ягелончык, 1440–1492 гг., 1/2 манеты ў 2 фрагментах (*малюнак 30*). Аверс: выявы не праглядаюцца, за выключэннем кропкавай абводкі. Рэверс: Пагоня ў правы бок, вакол – кропкавая абводка. Вага – 0,11 г; памеры – 11,9 × 7,3 мм і 6,5 х 3,3 мм.



*Малюнак 30*

7. Фрагмент пенязя (?), выявы нябачныя (*малюнак 31*). Вага – 0,08 г; памер – 6 × 13,7 мм.



*Малюнак 31*

Увосень 2019 г. на месцы знаходкі скарба быў закладзены шурф памерам 6 м. Культурны пласт адсутнічае, стратыграфія шурфа сведчыць аб тым, што гэтая тэрыторыя была моцна зніveліравана, верагодна, падчас правядзення меліярацыйных прац. Магчыма, што дадзены скарб быў невялічкім гаманцом, выпадкова страчаным побач альбо ў ручаі, альбо з'яўляецца часткай большага дэпазіту, ссунутай падчас земляных прац. Трэба адзначыць, што дагэтуль на тэрыторыі Беларусі не вядомы скарбы, у склад якіх акрамя пеняззяў Казіміра Ягелончыка (1440–1492) уваходзілі пражскія грошы. Прыкладны час захавання скарба – 40–90-я гг. XV ст.

Акрамя грашовых комплексаў у калекцыі «Нумізматыка» і «Каштоўныя камяні і металы» НГМ РБ захоўваецца шэраг адзінкавых манет ВКЛ, якія заслугоўваюць асобнай увагі[2]. Некаторыя манеты знаходзяцца на стадыі прыёму ў фонд музея.

Інвентарны нумар 053353 (*малюнак 32*). Пенязь, ВКЛ, Ягайла (?), абламаны, публікаваўся ў навукова-папулярным выглядзе [5, с. 45]. Знойдзены ў 2016 г. побач з вёскай Баранава Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Аверс: кірылічная легенда ці яе імітацыя. Рэверс: леў ідзе ўправа, лапа паднятая (Гулецкі, № 14D?). Вага – 0,42 г; памер – 11,1 × 15,9 мм.



*Малюнак 32*

Інвентарны нумар 053929/49 (*малюнак 33*). Пенязь, ВКЛ, Ягайла (?), абламаны, не публікаваўся. Знойдзены ў 2017 г. побач з вёскай Гудэлі Лідскага раёна Гродзенскай вобласці. Аверс: у цэнтры – выява шчыта з шасціканцовым крыжам, верхняя перакладзіна большая за ніжнюю. Леваруч і праваруч ад шчыта на ўнутранай кропкавай абводцы размешчаны два сімвалы з трох рысак – цэнтральныя рыскі

[2] *У гэты спіс не трапілі два пенязі Вітаўта тыпу «Калюмны/Наверша дзіды з крыжам» і адзін пенязь Уладзіміра Альгердавіча з-за адсутнасці звестак аб іх месцы знаходкі і пашкоджанняў.*



*Малюнак 33*

прамыя, бакавыя выгінаюцца ў бок ад цэнтральнай. Паміж знешняй і ўнутранай кропкавымі абводкамі – кругавая легенда. Рэверс: у цэнтры – выява вершніка з дзідай наперавес, накіраванага ў левы бок, над крупам у каня і над дрэўкам дзіды тры кропкі. Паміж знешняй і ўнутранай кропкавымі абводкамі – кругавая легенда (Гулецкі, № 40А). Вага – 0,52 г; памер – 15,7 × 11,4 мм.

Інвентарны нумар 056951 (*малюнак 34*). Пенязь, ВКЛ, Ягайла (?), абламаны (1/2 манеты), не публікаваўся. Верагодна, што манета знойдзена ў Лідскім раёне Гродзенскай вобласці, без дакладнай даты знаходкі (магчыма, на працягу апошніх 10 гадоў). Аверс: у цэнтры – выява шчыта з шасціканцовым крыжам. Леваруч ад шчыта, паміж ім і ўнутранай кропкавай абводкай змешчаны чатыры ці пяць кропак. Вакол унутранай кропкавай абводкі – нечытабельная кругавая легенда. Рэверс: у цэнтры – выява вершніка з мячом у правай руцэ, накіраванага ў правы бок. Вакол вершніка – двайная ўнутраная кропкавая абводка, за ёй – нечытабельная легенда (Гулецкі, аверс – № 41А?; рэверс – № 42А?). Вага – 0,37 г; памер – 13,6 × 8,4 мм.



*Малюнак 34*

Інвентарны нумар 053928/18 (*малюнак 35*). Пенязь, ВКЛ, Вільня, Вітаўт, падробка тагачасная, 1410–1430 гг.(?), публікаваўся [6]. Знойдзены ў 2015 г. у ваколіцах вёскі Гранічы Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. Аснова манеты выраблена з медзі, паверхня пакрыта слоем срэбра (≈10–12%) і волава (≈40–55%). Манета выканана тэхнікай чаканкі, кружок выразаны з металічнай пласціны, па краі манеты засталіся сляды ад рэжучага інструмента. Аверс: Калюмны, вакол вяроўчатая (?) абводка. Рэверс: дзіда з крыжам леваруч, вакол – вяроўчатая абводка. Вага – 0,28 г; дыяметр – 9,7 мм.

Інвентарны нумар 056952 (*малюнак 36*). Пенязь, ВКЛ, Вільня, Вітаўт (1410–1430), дэфармаваны, не публікаваўся. Знойдзены ў Лідскім раёне Гродзенскай вобласці ў 2019 г. Аверс: Калюмны, вакол – вяроўчатая абводка. Рэверс: дзіда з крыжам леваруч, вакол – вяроўчатая абводка (Гулецкі, № 150А?). Вага – 0,31 г; дыяметр – 12,4 × 13,7 мм.



*Стрэлкай пазначана кропка ад выстралу мікраінтэрферометра Лінніка МИИ-4*

*Малюнак 35*



*Малюнак 36*

Інвентарны нумар 053895 (*малюнак 37*). Аспр, Крымскае Ханства, Кафа, Хаджы Гірай (1441–1466). Публікавалася [7, с. 49; таб. 1, № 7]. На манеце змешчаны т. зв. «мсціслаўскі» надчакан. Знойдзена ў 2010 г. у ваколіцах вёскі Чарнілава, на беразе ракі Гаранка Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Вага – 0,44 г; дыяметр – 13,1 мм.



*Малюнак 37*

Інвентарны нумар 054556 (*малюнак 38*). Пенязь, ВКЛ, Вільня, Казімір Ягелончык (1440–1492). Публікаваўся ў навукова-папулярным выглядзе [5, с. 46]. Знойдзены ў 2000–2006 гг. у Полацкім раёне Віцебскай вобласці. Аверс: Калюм-



*Малюнак 38*

ны, у цэнтры – дзве вертыкальныя рыскі, ніжняя частка левай загнутая ўправа, правая рыска мае ў цэнтры кропку. Рэверс: Пагоня ў правы бок, абводка адсутнічае (Гулецкі, № 155D). Вага – 0,3 г; дыяметр – 13 × 11,9 мм.

Такім чынам, на працягу апошніх пяці гадоў калекцыя Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь папоўнілася невялікай, але грунтоўнай падборкай скарбаў і асобных раннелітоўскіх манет. Спадзяёмся, што яна будзе пашырацца і ў будучыні.

**Бібліяграфічны спіс:**

1. *Шталенков, И.Н. Новые находки литовских монет и слитков XIV–XV вв. (2007–2013) / И.Н. Шталенков // Numizmatikos rinkiniai: istorines Lietuvos ir su ja susijusiu saliu paveldas / Lietuvos nacionalinis muziejus. – Vilnius, 2015. – P. 205–209.*

2. *Шталенков, И.Н. Новые находки серебряных слитков-гривен в Беларуси / И.Н. Шталенков // Российский рубль. 700 лет истории: материалы междунар. науч. конф., Великий Новгород, 25–27 апреля 2016 г. / Новгородский музей-заповедник; отв. редактор П.Г. Гайдуков. – Великий Новгород, 2017. – С. 49–59.*

3. *Каталог выставы «Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля» / Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь; скл. Р.І. Крыцук, В.М. Сідаровіч, к.м. Л.І. Талкачова; рэц. І.Н. Колабава., М.А. Плавінскі. – Мінск: Кнігазбор, 2018. – 106 с.: іл.*

4. *Акт апрабавання № 1 ад 07.04.2016 // Архіў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. – 5 с.*

5. *Крыстэсіашвілі, С.М. Комплекс раннелітоўскіх манет з Маладзечанскага раёна са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь / С.М. Крыстэсіашвілі // ІІІ навук. чытанні памяці праф. В.Н. Рабцэвіча (1934–2008): тэз. дакл., Мінск, 16–18 мая 2018 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: В.М. Сідаровіч (гал. рэд.), І.Н. Колабава, А.М. Плавінскі. – Мінск: БДУ, 2018. – С. 38.*

6. *Крицук, Р.И. Новая находка поддельного денария Витовта типа «Колюмны-Наконечник копья с крестом» в Минской области / Р.И. Крицук // Нумизматика и фалеристика. – 2017. – № 4. – С. 32–33.*

7. *Шталенков, И.Н. К вопросу о «мстиславских» надчеканах / И.Н. Шталенков // Банкаўскі веснік. – 2012. – № 7. – С. 48–54.*

## Early Lithuanian coins and bullions in the collections of the National History Museum of the Republic of Belarus

**Roman KRYTSUK,** *National History Museum of the Republic of Belarus, Senior Researcher, Republic of Belarus, Minsk, e-mail: Kola.Sonca@gmail.com.*

**Abstract.** *The article introduces into scientific circulation and clarifies information about the early Lithuanian coins and bullions, which are in the collection of the National History Museum of the Republic of Belarus. The author gives a description and photographs of the findings, as well as represents their identification numbers.*